АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ

ГУДКІ

БДВ 1930

Б І Б Л І О Т Э К А   Ш К О Л Ь Н І К А

АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ

Г У Д К І

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК —1930

ЗЬМЕСТ

Зэказ № 677. 3.000 экз. ($1^{1/5}$ арк.) Галоўлітбел № 1794.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

Г У Д К І...

I

Як толькі ноч суровая
за небасхіл зьбяжыць,
зарніца каляровая
над краем задрыжыць.
У поле-шыр зьбіраюцца
колгасьнікаў палкі,
а ў горадзе ўзьвіваюцца
гудкі...гудкі...гудкі.

2

Рабочыя адважныя
на фабрыку ідуць—
хутчэй, хутчэй сярмяжную
збыць спадчыну-бяду.
Ў колгасы з самажнейкамі
імчацца цягнікі.
Пачуюцца з жалейкамі—
гудкі...гудкі... гудкі.

3

Як глянеш, сэрца радуе,—
будуем новы лад:

У кожнай хаце радыё
і радасьць расьцьвіла.
Была дрыгва далінаю
праз цэлыя вякі.
Цяпер гудуць машынныя—
гудкі... гудкі... гудкі.

4

Была зіма... Праменьні нам
бядою ткалі сказ;
тады, мы помнім, Леніна
ня стала сярод нас,—
і змоўклі ўсёй краінаю
сякеры, малаткі:
заплакалі хвілінаю —
гудкі... гудкі... гудкі.

5

Ç песьнямі агністымі
і крэпнем і расьцём!
Мы будзем комуністамі,
на зьмену мы ідзём!
Мы будзем абаронаю,
мы ўсе—франтавікі,—
хай клічуць нас чырвоныя—
гудкі... гудкі... гудкі.

ЯК ДЗЕЦІ ПАМАГАЛІ БУДАВАЦЬ САМАЛЁТ

Ці было калі на сьвеце,
каб малыя выйшлі дзеці
дружна так,—дапамагаць
край саветаў будаваць?
Колькі ўжо прайшло сталецьцяў,
ня было нідзе на сьвеце.
Працавалі многа надта,
але толькі на багатых...
Надышла пара другая—
ўсім працоўным скарбы краю!
І працоўныя адразу
на работу выйшлі разам...
Загулі-былі машыны
гучна так, бесьперапынна.
І, як волат, на руінах
вырастала моц краіны!
Нашы фабрыкі, заводы
ўсім паном недаспадобы.
І яны, чым толькі могуць,
хочуць зьнішчыць нам дарогу
ў сьвет вялікі, дзе рабочых
уціскаюць днём і ноччу,

Сёньня ў школе будзе сход.
Вольны дзень... і як на зьлёт—
Старыкі і гуртам моладзь
Сабіраліся у школу.

*

Устаў старшыня,
як сабраўся народ,
і прамову пачаў ён такую:
— Таварышы!
Наша краіна
нястрымна,
штогод,
долю куе залатую.
Заводы будуем,
і ставім масты.
Сушым балотаў абшары.
Але вось буржуі
супроць беднаты,
хочуць зьністожыць пажарам!?
Таму і сабралі мы
гэты вось сход,—
ёсьць прапанова такая:
каб мы памаглі
збудаваць самалёт
для абароны края!
— Правільна! Правільна!
Крыкнуў сход!
Паможам усе
збудаваць самалёт!

І мы дапаможам,—
крычыць дзетвара:
— На крыльлі сталёвыя
зможам сабраць!

*

Хто што мог—
усе давалі:
хто ячмень,
а хто авёс.
І казалі:
будзе лётаць
аж да сонца,
да нябёс!

Піонэры ўсім атрадам
выйшлі ў поле
палоць грады.
Працавалі,
аж да поту,
а работы шмат было.
Так стараньнем
зарабілі
самалёту
на крыло.

———

Збор ішоў...
І незадоўга
напісалі на завод:
„Калі ласка,
вось вам грошы,
пабудуйце самалёт”.

*

Роўна-роўненька праз год
прыляцеў той самалёт,
так чаканы,
так жаданы
пролетарскі самалёт!

Прывітаць лятуць з уздымам,
гулам неўгамонным.
О, крылатая машына
наша абарона!..

Распачаўся сход... Сяляне
прывіталі самалёт.
Шчыра-ўдзячны за вітаньне
у адказ казаў пілёт:

— „Кіньце працу адзіночна,
аб'яднайцеся ў колгас.
На падмогу шмат рабочых
пасылаюцца да вас.
Хто нас здужыць? Хто асіліць?
Хто саб'е з дарогі?!
Пролетарскай нашай сіле
песьня перамогі!
На вітаньні ўсе,—ў адказ
заклікаю у колгас!"

Зацягнуўся мітынг-сход.
Доўга гаварылі.
Лазяць дзеці ў самалёт,
вяжуцца на крыльлі.

Гэтак кожнаму ахвота
паляцець—сваё-ж яно!
Кожны хоча стаць пілётам,
кожны думае адно.
Сьмельчакі адразу селі,
чатырох узяў пілёт.
Загудзеў-зайграў пропэлер
і...падняўся самалёт!..

О, ляці, наш самалёт,
ўсё вышэй,
вышэй
што год!

САСНА

1

Вось адно, як струна,
сасонка расла
у бязьмежным
бары-гушчары.
А сягоньня яна
пачарнеўшы лягла
на асьнежным
фабрычным двары.

Загудзела піла,
застагнала сасна;
пры дарозе,
як сьлёзы, апілкі.
Сасонка расла,
як струна,
не адна—
з ёй і сёстры, як тыя асілкі.

Расла маладзіцай,
вяршынаю сьмела
зьвінела
і ў сьцюжу-завею.

Бывала, імчыцца
вей-вецер
і вецьце
лёгкім напевам авее...
І птушкі заграюць
сасонцы
да сонца
як быццам на гусьлях зялёных...
Цяпер, як скала,
скамянеўшы лягла,
закрыўшы галінкамі скроні.

2

Эх, сасоньніца-сасна,
дні суровыя...
Бервяно да бервяна—
хата новая!
Дый спрадвечная дрыгва,
нібы раніца,
Буйным цьветам хараства
зарумяніцца.
Гаратлівасьці былой
час пазбыцца нам!
Забудуем шыр балот
камяніцамі!
Эх, сасоньніца-сасна,—
дні суровыя...
Бервяно да бервяна—
хата новая.

3

Цяжкая праца, нялёгкая праца,
цяжка, браты, беднаце будавацца.
Капейку, другую за працай зьбярэм мы,
злыдзень змарнуе,—зьбіралі дарэмна!
Шмат каму нашае сёньня варожа—
гатовы атрутай,
— чорнай пакутай,
— чорнай пакутай
стрыножыць!

Чэшуцца рукі спрадвечных зладзеяў,
рвуцца стрыножыць, дый сіл не стае ім.
Корчыцца помста ў іх сэрцы здрантвелым...
А глянеш наўкола—будуюцца сьмела.
Праца віхрыста ўзьняла завіруху—
і хочаш ня хочаш:
— а песьню рабочых,
песьню рабочых
— слухай:

4

Гэй-жа, разам!
Гэй-жа, разам!
Гэй, адразу
возьмем
разам!
Гуртам!
Дружна!
— Хлопцы, здужым!

Гэй, яшчэ!
Яшчэ!
Яшчэ!
Будзе сонца
зьзяць ярчэй.
Што ня стане
ў час рабочы?
Ў нас і камень
зарагоча!
Гэй,
Адважна!
Ўсё для нас!
Дай, наляжам,
друж-на!
...Раз!

5

Эх, сасоньніца-сасна, —
нашы дні суровыя.
Бервяно да бервяна, —
хата новая.
Дзе-ж раскінута багна —
вырастуць дуброваю
за сасонкаю сасна —
сосны новыя!

ГЭРОЙ ПРАЦЫ

Закалыхалася сірэна ў белых сецях,
узбудзіўшы раніцу зімы...
На лядзянках коўзаюцца дзеці,
як калісьці коўзаліся мы.

Аздобілі бель-сьнежаныя ўзоры
шыбіны застыўшых камяніц...
На фабрыцы
машынным звонкім хорам
кіраваў —
сівенькі машыніст...

А ў тыя дні,
у дні ліхой пакуты,
ён зваў таварышаў,
ён клікаў не маўчаць —
а баставаць!
І сілаю магутнай
рваць путы-ланцугі!
Краінай —
заўладаць!..

Асьнежаны бязьмежныя даліны.
Асьнежаны фабрычных труб квартал.

З шаснаццаці гадоў ён ля машыны,
з шаснаццаці за працай карабоў.

Павевам гордай радасьці—ўрачыстасьць
рабочы клюб прыветліва спаткаў.
— Героя працы—машыніста—
насіла моладзь на руках!..

АКЦЯБРЫНЫ

Галаву сваю вечар павесіў,
заскрыпела адлігай зіма...
А за працаю гучна і весела,-
нудлівасьці ў працы няма!

Сёньня Максім з Кацярынай
з фабрыкі „Ўдарны Фронт"
справілі баль-акцябрыны—
Новае нашых дзён.

Піонэр ад рабочых падросткаў
гальштук чырвоны паднёс,
прамовай гарачай папросту
пажадаў, каб вялікім рос.

Комсамолец з радасьцю кінуў:
— Паслухай, таварыш Максім—
нас з табой парадніла—машына,
а з сынам—імя яго—КІМ.

Піонэр—комуніст—комсамолец
разгортвайце „Ўдарны Фронт".
Наша праца няспынна ніколі,
як жыцьцё палымнее, як горн!..

Радасьць працоўных успенена,
радасьць шчасьлівых хвілін.
Думкі бясьсьмертнага Леніна—
звонкія песьні машын.

ВЕКАПОМНЫЯ ПАХОДЫ

(*Шлях поэмы*)

...Эх, яблычка,
куды коцішся?
З Балаховічам ідзі,
азалоцішся...

Хай бяз ботаў, бяз шынэлі
у мяцелі-сьцюжы,
дружна біліся, гарэлі
агнявелі здужыць!
Як штыхі ад сонца, стальлю
вочы зырка зьзялі.
Што Кастрычнік горда даў нам,
адстаялі слаўна!

*

…И по винтику, по кирпичику
водрузили мы снова завод...

На разваліны-руіны—
узвод за ўзводам,
выйшла армія краіны
баявым паходам.
Загаілі фабрык раны
працай дружнаю, старанна.
Загулі-былі машыны
песьняй радаснай, нястрымнай.

*

...Мой саколік трактарыст,
а я трактарыстка...

Замест патронаў—зерне.
замест бранявіка,
трактар пераверне
хутар кулака!
За прасторы, за абшары
і на межы дрот—
Армія Чырвоная—
— Аграпаход!

*

> Згінце ў тры пагібелі
> Пілсудзкія, Цэргібелі...

Бяз працы ў голадзе гінуць
Мільёны рабочых краіны.
На біржах працы
зьлёт, сход.
Выходзіць змагацца,
галодны паход!
На барыкады, засесьці ў акопы
клічуць рабочых Эўропы!

*

...Параход ідзе,
дожджык крапае.
Будзем рыбу карміць
рымскім папаю...

Труціць, як калісьці,
імкнуцца народ.
Зьбіраюцца выйсьці
ў „крыжовы паход".
Разам з прадажным
штандарам хрыстовым
крыжам зьляжа—
„паход крыжовы"!

*

Мы закон жыцьця зьмянілі!
Ня стрымаць нас! Не асіліць!
Рух—на захад! Мусім там быць!
Узарвем заставы-дамбы!

Хто ня верыў, што ўзараем
поле безгранічна.
Што пачуецца над краем
гул машын фабрычных...

Хто ня верыў, што краіну
з векавых балот і ціны
прывядуць байцы паўстанцы
Ў край электрастанцый?!

. . . .

Чырвонасьцяжныя паходы
год за годам—лавай!—
Новых дзён цьвітуць усходы
бальшавіцкай славай!

ПЕРШАМАЙСКАЯ

(Колектыўная дэклямацыя)

Р а з а м

Дзень Першамая—
заводаў і фабрык!
Дзень Першамая—
колгасных палёў!
Сьвята вялікае!
Сонечнай фарбай
сьцелецца радасьць,
уздым змагароў!

1 - ш ы

Дэманстрацыя
сонцам авіта.

2 - г і

Сонца—лёзунг!

3 - ц і

Вясна—плякат!

Р а з а м

На сьвяточны зьбіраюцца мітынг
колёны рабочых брыгад.

1 - ш ы

Май шчасьлівы, май зялёны
колькі радасьці стазвоннай

2 - г і

Ты прынёс сям'і рабочай.

3 - ц і

Ты, як сьветач, цёмнай ноччу
шлях паказваеш мільёнам!

Р а з а м

Новых дзён жыцьцё будуем!
Радасьць нашая—крыляй!

1 - ш ы

Слухай!

2 - г і

Песьню!

3 - ц і

Баявую!

Р а з а м

Пролетарскі Першы май!

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ

Сьмела ўперад
дружным сьпевам!
Раз! Два! Левай!

Шлем, шынэль,
штых, патроны...
Дружна ўперад,
полк чырвоны!

Ўзвод за ўзводам,
крок за крокам,
сьмела ўперад!
Фронт шырокі!

Гэй, разгонны,
полк чырвоны,
час прышоў!
Раўняй колёны!..

Гэй-жа, левай!
Рушым!.. Дружна!
Хто супроць нас—
хутка здужым!

Сьмела ўперад
дружным сьпевам!..
Раз! Два! Левай!

ПАНСКІ ПАДАРУНАК

Прысьвячаецца барацьбітом з фашыстымі-окупантамі ў Заходняй Беларусі.

І ляціць бязьмежжам
вецер, як на крыльлях.
— Межы, толькі межы
думкі засланілі.

Там забралі права
думаць, нават думаць!
Чорная расправа—
панскі падарунак!

З панскага аблічча
дай сарвем завесу,—
колькі там налічым
жудасных процэсаў.

Чую крык нястрымны
полем і лясамі:
л е п ш ы с ы н к р а і н ы
с ё н ь н я к а т а р ж а н і н .

Ляскаюць кайданы,
ў катаргу магнаты

люд закатаваны-
гоняць з казэматаў.

Знаем мы, ў палацах
крыецца яднаньне
майстраў провокацый,
лютасьці й выгнаньня.

Толькі дзеці працы
сёл, мястэчак, местаў
сілай дэмонстрацый
шлюць свае протэсты.

Хай гучыць нястрымна
глеба пад нагамі:
лепшы сын краіны,
сёньня катаржанін!

Хай разьлёгся вужам
дрот, радзіўшы стогны.
Але не, ня здужыць
Беларусь мільёнаў!..

Чую я заўсёды
чую й ня дзіўлюся-—
ўзойдзе й там пагода
Савецкай Беларусі!

СТАЛІЦА

Учора, як золак расою
бледныя зоры гасіў,—
певень жыцьцё гарадзкое
прывычнаю песьняй будзіў.
У гонар сталетніх традыцый
з замкавых веж старыны—
рэспублікі нашай сталіцу
ганьбілі звонам званы.

Сёньня—мы пеўня ня чуем,
гудком сёньня сьцелецца дзень.
І песьню званоў векавую
ня чуем у лёце падзей.
Ваграпка няспынна іскрыцца,
плавіць званы на мэталь.
Рэспублікі нашай сталіца
ў прыбоях творчых хваль.

Заўтра—чаруючы ўзойдзе
сонца разьлівам душы
і новаю вуліцай пройдзе,
рытмамі новых машын.
Зямлі тваёй межы-граніцы
зруйнуе магутны комбайн.
Рэспублікі нашай сталіца
ў Вялікае Заўтра—крыляй!

СІЛУЭТЫ ВУЛІЦЫ

(З поэмы „Цені на сонцы")

*

У браме, ад зор і да зор
Сядзіць чорнамазы айсор.
Ён чотка
на скрынцы „чачотку"
перабірае шчоткай:
— Час кароткі
мы жывём.
Падыходзь, не эканом!
Гэй, таварыш, за два злоты
бліснуць боты
пазалотай.
Гэй, прахожы,
блізкі, дальні—
глянс наводжу
дасканальна!
Даваеннай
аксаміткай,—
праф-саю-зам
Скідка!

*

І тут-жа ў браме
звоніць нажамі,
вітае прадвесьню
вытворчая песьня:
— Сып, бяжы,

ўгару.
угрунь.
Вастру
нажы,
нажы—
вастру.
Гэй, жар, брусок,
яшчэ разок,
яшчэ разок—
блішчыць лязо!
Ўгару,
угрунь,
бяжы,
ляці.
—Чые нажы?
Плаці!

*

Рынуўся лёд! Затрашчэлі масты...
Крыга за крыгай—навала.
Рушыцца-крышыцца бераг круты,
быццам прыморскія скалы.
Сонца сваім прамяністым ключом
радасьць зямлі адамкнула.
Рвуцца ручайкі, імчацца наўзлом—
красавіковым гулам.

ГАЗЭТЧЫК

Ад самай раніцы, застыўшы ўвесь ад сьцюжы,
стаіць з газэтамі ля крамы на рагу.
Па бруку носіцца, мяцеліцаю кружыць
грукат гораду, звычайны грукат-гул...

Вецер і мароз—ну проста дух займаюць,
а ён крычыць, схапіўшы бляск навін:
— Чан-Кай-шы—нам здрадзіў у Кітаі!
— Кат-Пілсудзкі топіцца ў крыві!..

Над белым горадам зазьзяюць-ясна зоркі,
на вуліцах дрыжыць вітрын электра-сьвет...
З „апошніх вестак" скруціць ён... махоркі,
і дамоў... з астаткамі газэт.

На печцы цёплае журналы разглядае,
у вочы сонныя залазіць чорны дым—
і скроні мёрзлыя спакойна зачыняе:
віецца сон вяночкам залатым.

А раніцаю зноў—няхай мароз, завея,
няхай трашчыць старая галава—
у горад крочыць ён, і сэрца ледзянее,
і зноў за дзень—рубель, а можа два...

ВЯСНЯ ІДЗЕ

Дзень чаканы,
дзень румяны,
дзень прамежных струн,
дзень вясеньніх
лятуценьняў
к нам імчыцца ўгрунь.
На спатканьне
звонкім раньнем
выйду ў сьвет-прастор.
Гляну, гляну,
дзень вясьняны
рушыцца з-за гор.
Цёмнасіняй
злоснай плыняй
мчыцца-рвецца лёд.
Сонца спаліць
і бяз жалю
срэбраны сумёт.
Дзень вясеньніх
лятуценьняў
к нам імчыцца ўгрунь.
Выйду, гляну:
дзень жаданы,—
дзень прамежных струн!.

НОВЫ ГОД

І з году ў год
і кожны год
крыстальным стыжам
слаўся лёд.

Як з году ў год,
як кожны год,
прышоў на лыжах
Новы год.

Мінае ноч,
прасьнецца дзень.
За працай глянеш,—
градам пот.

Было адно,
як млявы цень
ішоў хістаньнем
Новы год.

Як цень ішоў,
пад лязг зубоў
лілася кроў
над кручаю.

была журба
і галыцьба
і барацьба
гаручая!

Мо хто й ня рад—
на новы лад
вядзем мы
дні і ночы,

Ня ў першы год
к нам Новы Год
ідзе
чорнарабочû ì !

Імчыцца ўгрунь
жыцьця разьбег,
як сьнег
далінай-
вольніцай.

Як з году ў год,
як кожны год
народ
за працай
клоніцца!

ЦАНА 20 кап.

Дзяр [illegible]

[illegible]

Государственное Издательство